# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!

Напзўна, невыпадкова першым абвяшчае вясну цудоўнае свята — Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка.

Вясенняе яркае сонца, нібы спаборнічаючы з мужчынамі, дорыць усім жанчынам бясцэнную цеплыню сваіх усмешак, цудоўнае прабуджэнне прыроды. І ўслед за ім з любоўю і ўдзячнасцю віншуюць жанчын родныя, сябры, таварышы.

Да ліку тых, хто ўслаўляе жанчыну, мы далучаем свой голас, і сардэчна віншуем жанчын універсітэцкага калектыва, якія сустракаюць нас раніцай у вестыбюлі універсітэта, перадаюць сваім выхаванцам веды і вопыт у лабараторыях і аўдыторыях, клапоцяцца аб здароўі, своечасовым атрыманні зарплаты і стыпендыі, дапамагаюць нармальнаму цячэнню ўсяго навучальнага працэсу.

Мы жадаем ім нязменнай сардэчнай шчодрасці і нявянучай душэўнай маладосці.



*Кожны дзень у студэнтаў хімічнага факультэта праводзяцца практычныя заняткі. Асаблівай цікавасцю вызначаюцца яны, калі хімікі працуюць у лабараторыі аптычнай фізікі. Тут кожны студэнт працуе самастойна.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнтка другога курса хімічнага факультэта Святлана Дупліцава.*



*Тамара Семяніхіна ў гэтым годзе закончыць універсітэт і, вядома, будзе выкладаць біялогію. А пакуль што Тамара праводзіць доследныя работы, рыхтуецца да дыпломнай.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнтка пятага курса біяфака Тамара Семяніхіна.*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГОД ВЫДАННЯ XXI
1968 г.
7 САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 9 (700)
ЦАНА 2 КАП.


## НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

З выпадку Міжнароднага дня жанчын у Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі адбыўся прыём. На прыёме прысутнічала вялікая група дзяўчат з ДРВ, Паўднёвага В'етнама, Кубы і іншых краін — студэнтак Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

* * *

Адбылася таварыская сустрэча па валейболу паміж жаночымі камандамі в'етнамскіх студэнтак падрыхтоўчага і асноўных факультэтаў (фізічнага, хімічнага, біялагічнага). Перамагла зборная жаночая асноўных факультэтаў. Сустрэча прысвечана Міжнароднаму жаночаму дню.

* * *

Напярэдадні свята замежныя студэнты сустрэліся з Героем Сацыялістычнай Працы Розай Кандрацеўнай Прусавай з МТЗ і з узнагароджанай медалем «За трудовое отличие» Аляксандрай Адамаўнай Лойка з камвольнага камбіната, якія шмат цікавага расказалі замежным сябрам аб жыцці савецкіх жанчын.

* * *

Аб ролі і месцы ленінскага камсамола ў нашым грамадстве, аб жыцці і дзейнасці універсітэцкай камсамольскай арганізацыі, аб тым, як сённяшняе пакаленне ўшаноўвае і памнажае слаўныя баявыя і працоўныя традыцыі расказаў в'етнамскім студэнтам сакратар камітэта камсамола БДУ М. Ціва ў гутарцы, якая адбылася нядаўна на падрыхтоўчым факультэце.



## МАЦНЕЮЦЬ НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ

*Паспяхова развіваецца супрацоўніцтва паміж калектывамі нашага і Люблянскага (Югаславія) універсітэтаў. Згодна двухбаковаму дагавору, здзяйсняецца абмен навуковай інфармацыяй, кадрамі, дасягненнямі. На мінулай нядзелі ў Любляну выехалі дэкан фізічнага факультэта дацэнт І. П. Зяцькоў і загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар І. М. Лушчыцкі. Яны прачытаюць лекцыі па сваіх спецыяльнасцях, азнаёмяць югаслаўскіх калег з нашым вопытам у арганізацыі навукова-даследчай і вучэбна-выхаваўчай работы, азнаёмяцца з выкладаннем грамадскіх і прыродазнаўчых навук у Люблянскім універсітэце.*

## КАМСАМОЛ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

На партыйным сходзе камуністы факультэта заслухалі справаздачу камітэта камсамола. Адзначана, што ў бягучым навучальным годзе ўзрасла роля камсамольскай арганізацыі ва ўсіх галінах студэнцкага жыцця, гісторыкі запісалі на свой лік нямала перамог і ў вучобе, і ў навукова-даследчай працы, і ў спорце. Аднак сход сканцэнтраваў увагу камсамольцаў на яшчэ не вырашаных пытаннях, падказаў камітэту, як узмацніць дзейнасць на галоўных напрамках работы: у вучобе, навуковых даследаваннях.

Па прапанове прафесара Ф. М. Нячая сход даручыў камсамольцам да 50-годдзя універсітэта сабраць матэрыял і падрыхтаваць кнігу «Біяграфіі выпускнікоў гістфака».

М. КРАСОЎСКАЯ.

## І ЗНОЎ СЕМІНАРЫ...

Вялікая вучэбная нагрузка ў філосафаў-другакурснікаў. Амаль штодзённа ім чытаецца па восем гадзін лекцый па розных прадметах, галоўным чынам па спецыяльнасці. Праз некалькі дзён пасля канікулаў у іх зноў пачаліся семінары.

Арганізавана і на высокім узроўні праходзяць практычныя заняткі па гісторыі замежнай філасофіі. Найбольшую актыўнасць праяўляюць Ю. Шынкар, Т. Адуло, Г. Санюк, В. Кузьмінаў, М. Віннікаў і іншыя. Са змястоўным і цікавым дакладам аб творы Платона «Пір» выступіў нядаўна на семінары І. Рабыкін.

Цяпер другакурснікі рыхтуюць даклады і выступленні па філасофіі Арыстоцеля.

Н. ХАЎРАТОВІЧ.

# ДЗЯЎЧАТЫ З АТРАДА «КАМЕТА»

## ТАК НАРАЖДАЛІСЯ РАДКІ

Было горача і млосна. Праз кожныя 15—20 хвілін хлопцы кідалі кельні, злазілі з рыштаванняў і прыпадалі да вядра з халоднай вадой.

Якраз у гэты спякотны час прыходзілі грузавікі з цэглай. Трэба было разгружаць.

— Алка!!!—крычаў аднекуль зверху камандзір.

Ала Усціновіч, брыгадзір «жаночай каманды», разумела з паўслова.

— Каця! Міра! Ларыса! Клава!... Дзе Клава!.. Хутчэй сюды, цэглу разгружаць будзём!

Дзяўчаты станавіліся «ў канвеер» і дружна з рук у рукі перадавалі цэглу. Будоўля пачынала дыміць чырвоным сухім пылам, які грапляў у нос, у вушы, прыліпаў да спацелага твару. Гэты пыл падымаўся над галовамі дзяўчат да хлопцаў, якія знаходзіліся вышэй, на рыштаваннях. Хлопцы фыркалі, злаваліся. Больш за ўсіх крычаў Сцяпан Даніlевіч. Ён увогуле любіў сварыцца з дзяўчатамі, хоць крыху і пабойваўся іх.

— Усціновіч, не пылі! — крычаў ён.—Раз-га-ню!...

— Нам тэмп высокі патрэбен,— разам з гучным смехам неслася знізу. — І, увогуле, мы вас не баімся...

Пылу падымалася яшчэ больш. А калі ён зусім асядаў, выходзілі дзяўчаты. Запыленыя, яны не былі падобны самі на сябе. Блішчэлі толькі белыя зубы, ды іскрамі гарэлі цудоўныя вочы. Наперадзе ўсіх у матроскай цяльняшцы і шортах стаяла Алка. Цяльняшка ўжо не была цяльняшкай: белыя паласы яе сталі чырвонымі, а чорныя —рыжымі.

— Ну што!!

— Што!..

— Што рабіць далей!

— Адпачніце...

Але адпачываць не было калі.

— Ліда, раствору няма,— крычаў зверху Сцяпан.

— Таіса!! Дзе ты! — чуўся голас Мар'яна Дуксы.

— Клава! Сюды...—клікаў Лёня Макаўчык.

Дзяўчаты разыходзіліся па сваіх мясцах, кожная да свайго «партнёра». Зноў кіпела работа...

А вечарам таго ж дня, калі пісаўся гімн студэнцкага будаўнічага атрада «Камета», нарадзіліся новыя радкі:

...Высока ты, наша  
стенушка,—  
Метра три уж до земли,  
Хороши вы, наши  
девушки,  
И в строительной  
пыли...»

## НЯЛЁГКІ АДПАЧЫНАК

Канцэрт, з якім мы хацелі выступіць перад калгаснікамі, падрыхтаваць было нялёгка. Не кожнаму з членаў атрада даводзілася бываць на сцэне. Але... тое, што кожны з іх меў артыстычныя здольнасці, было бясспрэчным. Да таго ж ініцыятыву ў свае рукі ўзялі дзяўчаты. Ліда Брыгадзіна згадзілася кіраваць танцавальнай часткай, Ала Усціновіч—хорам, Клава Юша—дэкламаваннем.

Здавалася б, усё было вырашана, абмеркавана, разложана па костачках. Але тут нечакана некаму прыйшло ў галаву, што на сцэне дзяўчаты абавязкова павінны танцаваць у парах з хлопцамі.

— Што гэта за танцы, калі дзяўчына танцуе з дзяўчынай. Не той эфект,—гаварылі дзяўчаты.

Увогуле хлопцы згаджаліся, а калі справа дайшла да падбору кандудатур, пачаліся спрэчкі. Усе пачалі аднекваіца.

— Акрамя італьянскага танга, хоць забі, нічога не ўмею гаварыў адзін.

— Куды мне з такою камплекцыяй...— адмахваўся другі.

— А я зусім не танцую,— сцвярджаў трэці.

І так кожны.

— Навучым, нідзе не дзенецеся. Як з вясковымі дзяўчатамі ў клубе,—дык аж пыл курыць. І талент ёсць...

Дзяўчаты наступалі, а хлопцам адступаць не было куды, прышлося здацца.

Пачаліся рэпетыцыі. Да іх прыступалі адразу ж пасля працоўнага дня. Пакой дзяўчат ператварыўся ў швейнае атэлье: Клава Юша ўзялася шыць сукенкі для танцораў, а пакой хлопцаў ператварыўся ў кансерваторыю: рэпетыравала Ала Усціновіч. Танцоры практыкаваліся на сцэне калгаснага клуба. Адразу ў хлопцаў нічога не клеілася. «Беларуская полька» Лёні Макаўчыка нагадвала шэйк, Толя Бруцкі збіваўся на «Кракавяк», а Мар'ян Дукса рабіў нейкія складаныя рэверансы. Партнёршы выбіваліся з сіл. Хлопцы адчайваліся:

— Мы ж гаварылі, што нічога не атрымаецца,—папракалі яны.

Але дзяўчаты і тут не адступалі. І справы пайшлі на лад...

Канцэрт быў паспяховым. Асабліва апладыравалі калгаснікі танцорам. Яны і не падазравалі, што хлопцы танцавалі на сцэне, можа, толькі першы раз у сваім жыцці. І не многія ведалі, што сваім поспехам яны абавязаны дзяўчатам.

* * *

У будаўнічым атрадзе іх было сем, сем вясёлых, няўрымслівых і працавітых дзяўчат. Яны былі настолькі розныя і падобныя адна на адну, як сем дзён аднаго тыдня, як сем колераў адной вясёлкі. Клава Юша, Таіса Дзевялтоўская, Міра Комык, Ліда Брыгадзіна, Ала Усціновіч, Ларыса Шэрая, Каця Васілевіч. Яны былі побач з намі. З імі было лёгка і весела. Часта, разумеючы гэта, яны пыталі ў нас словамі песні:

«Скажите нам, ребята,  
Скажите откровенно;  
Было б скучно, наверно,  
На свете без девчат!..»

І мы згаджаліся.

А. СВОРАБ.



НАСКОВА НАДЗЯ І СЕДУР СВЯТЛАНА — СТУДЭНТКІ ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ІХ ЧАСТА МОЖНА БАЧЫЦЬ РАЗАМ У ЧАС ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ І ЛАБАРАТОРНЫХ ПРАЦ.

# ІМ КАЖУЦЬ ДЗЯКУЙ

Прыемна наведаць бібліятэку гуманітарных факультэтаў. Тут звычайна цябе сустракаюць ветліва і прыязна.

Вось Тамара Якаўлеўна Цыпоркіна. Яна заўсёды хутка знойдзе патрэбную кнігу, парэкамендуе штонебудзь з навінак. Вельмі начытаны чалавек Тамара Якаўлеўна, з ёй можна пагутарыць на розныя тэмы: аб прыродзе, аб літаратуры. Цікава размаўляць і з Валянцінай Яўгеньеўнай Рудакоўскай. Заўсёды адчуваеш сардэчныя адносіны да цябе, да тваіх інтарэсаў.

Кацярына Міхайлаўна Пятосіна і Фаіна Канстанцінаўна Таранда ўмела прапагандуюць літаратуру. Яны арганізоўваюць выстаўкі кніг, тэматычныя агляды, складаюць рэкамендацыйныя спісы.

Кіруе бібліятэкай Валянціна Паўлаўна Ананька. Гэта яна асноўны арганізатар літаратурных вечароў, дыспутаў, абмеркаванняў навінак.

За шчырасць студэнты адплочваюць дружнаму калектыву павагай і любоўю.

Хочацца ад душы павіншаваць супрацоўніц бібліятэкі са святам 8 сакавіка і пажадаць ім добрага здароўя і поспехаў у працы.

А. ЛЯПІЧ,  
рэдактар  
выдавецтва БДУ.

*Сяргей ЗАКОННІКАЎ*

# МАТЧЫНЫ СНЫ

Наплываюць пад ранак салодкія сны,  
Б'юцца ў шыбы калючай галінкай  
агрэсту.  
Да матуль на світанні прыходзяць сыны,  
Што ляжаць у палях пад Смаленскам  
і Брэстам.  
Шынялі і пілоткі здымаюць яны,  
На грудзях папраўляюць медалі  
і ордэны.  
І рукамі, што пахнуць дымамі вайны,  
Валасы гладзяць мамам, спакойным  
і гордым.  
На світанні ў матуль абрываюцца сны...  
Тымі кулямі, пад якімі спатыкнуліся  
іх сыны.

# ЛІСТ

Пішу заўсёды ўдзень і  
уночы.  
Да маці свої бясконцы  
ліст.  
А ля мяне, як зоркі, вочы,  
Дзвіны успенены разліў.

А прада мной на ўзгорку  
хата,  
Таполяў вострыя штыхі.  
Над імі я, як птах  
крылаты,  
Падняўся ў вырай з-пад  
страхі.

Сярод азёр, крутых  
пагоркаў,  
Плылі далёка бальшакі.  
Запомніў слёз нямую горыч,  
Цяпло матулінай шчакі.

А будзе цяжка, я пакліччу  
Яе, як клічуць важака.  
Падлёткам, нібы на  
галінцы,  
Прыціхну ў матчыных  
руках.

Я трызню ласкай рук  
шурпатых,  
Агнём вяргіняў ля  
платоў,  
Як парус, посцілкай  
напятай.  
Старэчым шэптам чаратоў.

Я трызню першымі дымамі,  
Што вырастаюць над  
сялом.  
Нібыта вырай, слова  
«мама»  
На вуснах шастае крылом...

Ля Глыбачкі за сонцам  
следам  
Вяснянка выйшла на шашу.  
Чакай, матуля. Я прыеду.  
Я ліст свой дома дапішу.

# Палку вучоных прыбыло

У выкладчыка юрыдычнага факультэта Людмілы Аляксееўны Прыходзькі двайное свята. Яна завяршыла вялікую навуковую працу. Незадоўга да 8 сакавіка на Савеце па прысуджэнню вучоных ступеней па філасофіі, гісторыі, эканамічных і юрыдычных навуках Л. А. Прыходзька абараніла кандыдацкую дысертацыю і атрымала вучоную ступень кандыдата юрыдычных навук.

Выступіўшыя на савеце афіцыйныя апаненты доктар юрыдычных навук прафесар С. Л. Фукс і кандыдат юрыдычных навук І. А. Юхо адзначылі значную навуковую каштоўнасць яе працы.

Мы рады напярэдадні 8 сакавіка павіншаваць Людмілу Аляксееўну з гэтай навуковай перамогай.

*Вялікую педагагічную і навуковую працу вядзе дацэнт кафедры агульнай геалогіі геолага-геаграфічнага факультэта Вера Васільеўна Шчыглова. Яна выкладае палеанталогію, летам кіруе палявой практыкай студэнтаў-геолагаў.*

*НА ЗДЫМКУ: В. В. Шчыглова ў сваім рабочым кабінеце.*

*Большасць юнакоў і дзяўчат з В'етнама за кароткі тэрмін авалодалі рускай мовай. Сярод лепшых студэнтаў Хуан Тхі Суан Лам.*

*НА ЗДЫМКУ: Хуан Тхі Суан Лам у гукатэхнічным кабінеце.*

*Фота І. АСКІРКІ.*







# АДНА З МНОГІХ

На нефарбаваных дзвярах вісіць шыльда — «Архіў». Тут працуе Анна Сцяпанаўна Гарбачэнка. Кожны дзень яна адкрывае гэтыя дзверы і акунаецца ў жыццё навучальнай установы.

— Я без студэнтаў не магу жыць, — часта гаворыць Анна Сцяпанаўна.

Студэнт заканчвае універсітэт, а памяць аб ім застаецца за дзвярыма архіва, у добрых руках Анны Сцяпанаўны.

Неяк я папрасіла яе расказаць аб сабе.

— Што ты, Аня?.. Я ж просты работнік. У мяне звычайнае жыццё, — здзівілася яна.

Дзяцінства Анны Сцяпанаўны прайшло ў Смаленску. Там яна пачала працаваць у педагагічным інстытуце, там сустрэла рэвалюцыю.

А ў 1918 годзе яна была ўжо ў Чырвонай Арміі. Не цуралася цяжкай работы. Была санітаркай. Абмывала раны, мыла бялізну, рыхтавала ежу байцам, пісала пісьмы да іх родных пры капцілцы. Потым закончыла курсы сясцёр.

Калі разлічыліся з ворагамі, Анна Сцяпанаўна засталася працаваць у Мінску, у пединстытуце.

22 чэрвеня 1941 года Мінск адзін з першых гарадоў трапіў пад бамбёжку гітлераўскай авіяцыі. Анна Сцяпанаўна разам з другімі супрацоўнікамі інстытута ў першыя дні вайны пайшла на фронт. З 3-ім Беларускім фронтам яна прайшла нялёгкую дарогу даўжынёй у чатыры гады. Атрымала медаль «За перамогу над Германіяй».

І вось ужо каля 20 год Анна Сцяпанаўна працуе ў нашым універсітэце.

**А. ФРЫДМАН,**
**студэнтка матфака.**

# РАМАНТЫКА—У ПАДАРОЖЖЫ

**З нецярпеннем чакаеш канікул, каб зноў адправіцца ў паход.**

**Поезд імчыць усё далей на поўнач. Вось ужо засталіся ззаду Орша, Віцебск, Ленінград. Петразаводск сустракае пякучым маразам. Параўноўваем з нашым, але вушы і нос не згаджаюцца адзначыць аналогію. Са сталіцы Карэліі пачынаецца наш маршрут. 190 кіламетраў. Наколькі былі яны рознымі! Да самага гарызонту заснежаная і роўная паверхня Анежскага возера, шэрае паўночнае неба, ды зрэдку за хмурымі воблакамі сонечны круг. Сонечная дарожка кліча да сябе, але нам ісці не па ёй. А пасля раптам возера разразаецца невядома чыім вялізным нажом, вада і таросы затрымліваюць рух.**

**І яшчэ на Анезе бывае завіруха, пасля яе неба становіцца ліловым, нібы пазваночак. Пазваночкавага колеру неба і званы Кіжэй. Паэзія ажыўленага ў чалавечых руках дрэва, заснежанасць азёр і лясоў, бязлікая колькасць турыстаў — вось што такое Кіжы зімой.**

**Яшчэ некалькі кіламетраў па возеры — і мы на мецерыку. Чамусьці карэльская зіма была да нас прыхільнай, тэмпература павысілася, і прышлося лыжны турызм чаргаваць з хадзьбой пешшу. Пяшком прыйшлі ў Ківач. Гэта заказнік па цячэнню ракі Суны. Вельмі хацелі пабачыць вадапад, але ад недахопу вады зімой ён маўчаў. Не пашанцавала. Затое прыгожымі былі высокія сосны, скалы, пушысты снег...**

**Нас было адзінаццаць. З шасці хлопцаў — тры Віктары, з пяці дзяўчат—дзве Галі. Прывезлі песні, дарожныя ўражанні.**

**Хочаце з намі пазнаёміцца — прыходзьце ў турклуб.**

**А. ГАЛАЛОБАВА,**
**студэнтка IV курса**
**геолага-геаграфічнага**
**факультэта.**

# ДАПІСВАЕЦЦА ЧАЦВЁРТАЯ ГЛАВА

Выпускнікі гістарычнага факультэта выйшлі на фінішную сцежку, якая вядзе прама да дыпломных прац і заканчэння вучобы. Днямі яны здавалі экзамены па гісторыі філасофіі. Выкладчык застаўся задаволены адказамі студэнтаў. З 70 чалавек 21 атрымалі «выдатна», 46 — «добра» і толькі 3 — «здавальняюча». Парадавалі сваімі глыбокімі ведамі В. П. Саламаха, Т. І. Максіна, А. К. Ляонаў, С. С. Саннікаў і іншыя выпускнікі. Яны паказалі не толькі веданне прадмета, але і ўменне правільна выкарыстоўваць матэрыял другіх навук, якія яны вывучалі ва універсітэце — грамадзянскай гісторыі, палітэканоміі, навуковага камунізма, атэізму.

Да гэтага гісторыкі-выпускнікі паспяхова здалі экзамены па спецкурсах. Хутка можна брацца за напісанне дыпломных. Дарэчы, гэта апошні курс на факультэце, які вывучаецца па скарочанай праграме, студэнтам прышлося многія раздзелы навук засвойваць самастойна. Наогул было мала часу і шмат цяжкасцей. Тым больш радуе той факт, што многія за час вучобы, рыхтуючы кантрольныя, курсавыя і выступленні да семінарскіх заняткаў, сабралі цікавы матэрыял для дыпломных.

Дапісваецца чацвёртая глава. Наперадзе самыя цяжкія — главы працоўнага жыцця.



# НОСЬБІТЫ СПАРТЫЎНАЙ СЛАВЫ

**Заўтра ў нас вялікае свята — Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка. Напярэдадні яго хочацца адзначыць нашых дзяўчат-спартсменак, якія неаднаразова абаранялі спартыўны гонар рэспублікі, горада, а таксама нашага універсітэта.**

**На хімічным факультэце вучацца цудоўныя спартсменкі, майстар спорта па лыжах, чэмпіёнка СДСТ «Буравеснік», БССР, горада Мінска Ольга Філіповіч, чэмпіёнка міжнароднай сустрэчы з Балгарыяй, член зборнай каманды БССР, неаднаразовы прызёр першынства БССР і студэнцкіх гульняў Таццяна Філонава, член зборнай каманды БССР па лёгкай атлетыцы Валянціна Бяляева, кандыдат у майстры спорта па спартыўнай гімнастыцы Ліля Жыгунова, кандыдат у майстры спорта па плаванню Ала Ліпніцкая, першаразрадніца па ручному мячу, сярэбраны прызёр БССР 1967 года Ала Войтніц.**

**Асабліва хочацца адзначыць капітана жаночай валейбольнай каманды Тамару Барысаву. Яна была прызнана лепшым ігракам занальнага першынства БССР сярод жаночых каманд і ўзнагароджана спецыяльным прызам.**

**На трэцім курсе біялагічнага факультэта вучацца кандыдат у майстры спорта па спартыўнай гімнастыцы, член юнацкай зборнай горада Мінска, член зборнай Белсавета «Буравеснік» Ірына Пахрыцына, выдатная лыжніца і актывістка Света Альшэўская, майстар спорта па плаванню, член зборнай каманды БССР, чэмпіён і рэкардсмен БССР Людміла Дзегцярова.**

**Ёсць добрыя спартсменкі на філалагічным факультэце, такія, як майстар спорта па баскетболу, член зборнай каманды БССР Тамара Кабанава, Таня Семянчук і Эла Шагісултанава, якія ўнеслі вялікі ўклад у перамогу зборнай каманды універсітэта па валейболу ў занальным першынстве БССР, што адбылося 16—19 лютага ў горадзе Магілёве.**

**На матфаку вучацца член зборнай каманды па лёгкай атлетыцы Белсавета «Буравеснік» Галіна Колтун, чэмпіён занальнага першынства БССР па валейболу Валя Трахіменка; на гістарычным факультэце — член зборнай каманды Белсавета «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы Дзіна Ліра, чэмпіён занальнага першынства па валейболу Тамара Біч.**

**Нельга не адзначыць і выдатную спартсменку, міжнароднага майстра спорта па лёгкай атлетыцы, выкладчыка кафедры фізвыхавання Аляксандру Іванаўну Жалабковіч, якая неаднаразова абараняла спартыўны гонар нашай рэспублікі на міжнародных спаборніцтвах.**

**Жадаем нашым дзяўчатам новых поспехаў у вучобе і спорце, вялікага шчасця.**

**В. СОБАЛЕВА.**



# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

У жыцці Белдзяржуніверсітэта, як і ў многіх іншых вну краіны, важнае значэнне мелі рашэнні ліпеньскага Пленума ЦК ВКП(б) 1928 года. Пленум прызнаў падрыхтоўку новых спецыялістаў важнейшай задачай усёй партыі.

Вялікую ўвагу Пленум удзяліў паспяховасці студэнтаў. На першы план ставілася вучоба. Рэкамендавалася таксама ўсемагчыма заахвочваць навукова-даследчую працу студэнтаў, якая была прызнана іх важнейшым грамадскім доўгам.

Адпаведна рашэнням Пленума была перагледжана работа ва універсітэце. Узмацнілася барацьба за павышэнне акадэмічнай паспяховасці. Былі прыняты рашучыя меры да скарачэння другагодніцтва. Сталі выключаць непаспяваючых студэнтаў. Камуністаў і камсамольцаў за нядбайныя адносіны да вучобы прыцягвалі да адказнасці па партыйнай і камсамольскай лініі.

Значна скараціўся лік сходаў і пасяджэнняў і іх працягласць. Катэгарычна забаронена было склікаць абы якія нарады ці сходы ў час заняткаў. Навялі парадак з размеркаваннем грамадскіх даручэнняў студэнтам.

Некаторыя меры датычыліся ўмацавання дысцыпліны. Строга правяралася наведванне семінарскіх заняткаў. Але па-сапраўднаму ўмацаваць працоўную дысцыпліну ўдалося толькі пасля ўвядзення ў 1930 годзе абавязковага наведвання лекцый.

Каб лепш вывучыць жыццё студэнтаў, іх ідэйна-тэарэтычны ўзровень, матэрыяльныя ўмовы і ўвогуле ўвесь быт, а таксама хутчэй ліквідаваць недахопы, якія перашкаджалі навучальнаму працэсу, Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва ЦСПСБ распаўсюдзіла ў лютым 1929 года сярод студэнтаў універсітэта «Культурна-бытавую анкету». Ва ўступе анкеты падкрэслівалася: неабходна, каб кожны студэнт, які атрымаў анкету, адразу ў навучальнай установе запоўніў яе, сур'ёзна, шчыра і вычарпальна адказаў на ўсе пытанні.

Строга ананімная анкета складалася з дзевяці раздзелаў, якія ўключалі 61 пытанне. Першы раздзел датычыўся біяграфічных звестак.

У другім раздзеле высняляліся матэрыяльныя і бытавыя ўмовы жыцця, сродкі існавання (служба, стыпендыя, дапамога бацькоў, урокі, выпадковыя заработкі), колькі мае сродкаў у месяц, месца жыхарства (інтэрнат, уласная кватэра, у бацькоў), дзе абедае (у сталовай, дома).

Пытанні трэцяга раздзелу датычыліся санітарна-гігіенічных умоў: размер плошчы пакою ў інтэрнаце і колькі чалавек там жыве, адмоўныя бакі абставін (шум у пакоі, холад, духата, сырасць, недахоп асвятлення, як часта мяняе студэнт бялізну, самаадчуванне, стан здароўя, ужыванне спіртных напіткаў, ці сварыцца ён, курыць, ці ўжывае касметыку, ці гуляе ў карты?)

Чацвёрты раздзел прысвячаецца выбару спецыяльнасці і таму, як студэнт авалодвае сваёй прафесіяй. Неабходна адказаць, наколькі ён задаволены сваім выбарам, па якіх падручніках і дапаможніках рыхтуецца да заняткаў, якія недахопы ў навучальнай установе і як лепей ліквідаваць, студэнт павінен быў выказаць думку аб навуковых супрацоўніках. Далей патрэбна было напісаць аб удзеле ў гуртках (навуковых, палітычных, грамадскіх).

Пяты і шосты раздзелы павінны былі паказаць ступень палітычнай адукаванасці студэнтаў: якія ён чытае газеты, ці ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта, якую грамадскую работу выконвае, адносіны да рэлігіі, да нацыянальнай палітыкі партыі, думку аб рабоце студэнцкіх арганізацый, аб самакрытыцы ва універсітэце.

Сёмы раздзел прадугледжваў вывучэнне эстэтычных густаў студэнтаў.

Восьмы раздзел павінен быў даць характарыстыку сямейнага становішча студэнтаў і іх адносін да палавой праблемы. У дзявятым раздзеле былі пытанні, якія характарызавалі распарадак: сон, наведванне лекцый, падрыхтоўка да заняткаў, культурныя запатрабаванні (у гадзінах).

Якімі ж былі вынікі вывучэння анкет студэнтаў за 1928—1929 навучальны год? На анкету адказалі 881 чалавек — 34,5 працэнта. Сярод іх — членаў КПБ — 233, членаў ЛКСМБ — 255. Па ўзросту ад 18 да 25 гадоў — 538, па сацыяльнаму становішчу: сялян — 378, служачых — 257, рабочых — 227, сродкі існавання — стыпендыятаў — 567, астатнія — служачыя ці жыўшыя на сродкі бацькоў; большасць студэнтаў жыло ў інтэрнатах, але 355 чалавек — на ўласных кватэрах.

Партыйнае бюро БДУ, якое разглядала вынікі вывучэння анкет, прызнала жыллёвыя ўмовы студэнтаў нездавальняючымі: у пакоях знаходзілася па 10—12 студэнтаў, было многа скаргаў на холад у інтэрнаце і недастатковае асвятленне. На дрэнны стан здароўя скардзіліся 322 чалавекі. Ужывалі спіртныя напіткі —80 студэнтаў, дапускалі сварку — 258.

Анкеты паказалі, што 399 студэнтаў карысталіся скарочанымі вучэбнымі дапаможнікамі, 214 не былі забяспечаны вучэбнымі дапаможнікамі. Амаль усе студэнты ўдзельнічалі ў гуртках. Чыталі белетрыстыку 317 чалавек, палітычную літаратуру 192, сістэматычна чыталі газеты 505 чалавек, не сістэматычна — 288. Чыталі газету «Правда» 672 чалавекі.

Вывучэнне анкет, якія запоўнілі многія студэнты, дазволіла вызначыць рад мер па ліквідаванню недахопаў і паляпшэнню навучальнага працэсу і матэрыяльна-бытавога становішча студэнтаў.

Сорак гадоў прайшло пасля апісаных падзей. За гэты час наш універсітэт далёка шагнуў наперад, дасягнуў велічных поспехаў. Ён ператварыўся ў магутны цэнтр навукі Савецкай Беларусі, павялічылася колькасць факультэтаў, выраслі высокакваліфікаваныя навуковыя кадры, лік студэнтаў павялічыўся ў многа разоў. Пабудаваны светлыя, добра абсталяваныя вучэбныя карпусы і цудоўныя інтэрнаты, непамерна палепшылася матэрыяльнае становішча студэнтаў. Больш дасканала арганізаван навучальны працэс. Але вывучэнне мінулага, аналіз цяперашняга адкрываюць шырокія гарызонты для далейшых дасягненняў.

**М. ФРЫДМАН,**
**дацэнт.**

*НА ЗДЫМКУ: старэйшы выкладчык БДУ М. Б. ФРЫДМАН (злева.)*

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# БЫЛІ І ПАМЫЛКІ

Ішоў камсамольскі справаздачна - выбарчы сход. Звычайна спакойная аўдыторыя гудзела...

— Чаму ў нас горш, чым ва ўсіх: ні вечароў адпачынку, ні дыспутаў, ні экскурсій?

— Жывем, як у лесе. Кожны хвалюецца толькі аб сабе...

— Куды глядзіць бюро!

— А што ты зрабіў для курса?

Калі раней на сходах ля стала можна было ўбачыць толькі «штатных» выступаючых—стараст Івана Русакевіча і Васіля Гурына ды яшчэ двух-трох членаў бюро, зараз гаварылі ўсе. Гаварылі шчыра, усхвалявана.

Цяжка сказаць, калі наспелі такія перамены. Але ўсім было ясна. Курс змяніўся. З дробных адасобленых групак вырас вялікі калектыў. З'явіліся агульныя інтарэсы, зацікаўленасць да спраў на курсе.

Напружана праходзілі выбары новага бюро. Кожная кандыдатура абмяркоўвалася з усіх бакоў: вучоба, адносіны да таварышаў, дзелавыя якасці. І той, хто быў выбран, мог ганарыцца: ён заслужыў давер'е таварышаў...

Было б шаблонам расказваць зараз, як новае бюро змагалася з недахопамі, павольна, але настойліва выпраўляла ранейшыя памылкі, набывала вопыт.

Былі і ў нас памылкі, спрэчкі і разлад. Але галоўнае не ў гэтым. Рабятам шчыра захацелася даказаць, што другі курс не такі ўжо дрэнны, якім прывыклі яго прадстаўляць з трыбуны камсамольскіх сходаў, што і мы «не лыкам шыты».

Ужо тады, у вераснёўскія і кастрычніцкія дні, пачалі думаць аб будучым, аб зімовай сесіі. Загадзя распрацавалі графік здачы экзаменаў і залікаў, абдумалі, як і каму можна дапамагчы. Рэгулярна пачала выходзіць курсавая насценгазета «Мы». Заўважце, назва газеты невыпадковая. Яна сімвалічна абазначае рост дружбы аднакурснікаў. Праз некалькі дзён выйшаў першы нумар курсавога «Камсамольскага пражэктара».

Незаўважна змяніліся абставіны. Палепшылася наведванне лекцый. Больш упэўненымі і яркімі сталі адказы на семінарах па гісторыі КПСС, рускай і беларускай мовах. Манаполія выдатнікаў Васіля Гурына, Мікалая Сідаровіча, Ядвігі Халява пахіснулася. Цяпер у спрэчку з імі на семінарах уступалі Валерый Рыдкі, Васіль Шырко, Анатоль Рыдкін, Святлана Дуброўская.

...Аднойчы на камсамольскім сходзе ўспыхнула спрэчка. Студэнтка В. не згаджалася з рашэннем бюро курса і заўзята выступала супраць. Дарэмнымі былі спробы старшыні схода ліквідаваць «канфлікт» мірна. В. раз-пораз ускоквала з месца, абрывала выступаючых. Сход ператвараўся ў сварку. І тады сваё слова сказаў курс. Хтосьці з залы прапанаваў вывесці В. са сходу. Аднакурснікі падтрымалі, але В. не чакала, пакуль курс прагаласуе «за». Высока трымаючы галаву, але адчуваючы, што вось-вось расплачацца, яна выйшла з аўдыторыі.

Вось вам і прыклад. Колькі мы гаварылі аб дысцыпліне! На сходах і дыспутах, у лекцыях і дакладах. І ўсё з пустога ў парожняе, бо ўсе гэтыя павучанні былі афіцыйнымі, запланаванымі, а таму, не шчырымі. А тут стыхійна чалавек атрымаў урок, які запамятаецца яму на ўсё жыццё.

Я не хачу выступаць супроць плана. Ён быў і застанецца асновай дзейнасці любой арганізацыі. Але, паверце, размовы і спрэчкі, якія ўзнікаюць нечакана, куды больш шчырыя і цікавыя.

Нядаўна другакурснікі абмеркавалі вынікі трэцяга семестра. Вынікі радуюць: 80 працэнтаў студэнтаў здалі сесію толькі на добра і выдатна. Сярод іх дзевяць выдатнікаў.

Нельга вывесці ўсе складаемыя поспеху. Іх вельмі многа. Але галоўнае-шчырая таварыская ўзаемадапамога, заснаваная не на правілах этыкету, нават не на камсамольскім сумленні, а на сапраўднай сяброўскай дружбе.

**І. АСІНСКІ,**
**сакратар камсамольскага бюро 2-га курса факультэта журналістыкі.**

# У НАШЫМ ІНТЭРНАЦЕ

**Вялікую выхаваўчую работу сярод студэнтаў у інтэрнаце № 5 па вуліцы Кастрычніцкай вядуць камсамольцы Р. Лёгкая, Л. Зянькова, І. Рыбыкін, камуніст І. Бацечка. Нездарма калектыў інтэрната вылучыў іх у склад студэнцкага савета.**

**Добрымі справамі вызначаюцца і іншыя актывісты. Камсамолец Раменчык па сваёй ініцыяленне табліцы Белай ленен табліцы Белай алімпіяды, камсамольцы Лісіменка і Шэцікаў прымаюць удзел у арганізацыі вечароў.**

**Студэнцкі актыў удзяляе вялікую ўвагу ўзмацненню дружбы паміж нашымі і в'етнамскімі студэнтамі. Значная роля ў гэтым належыць тым студэнтам, якія жывуць разам з в'етнамскімі сябрамі.**

**Аднак ёсць і такія камсамольцы, паводзіны якіх даводзіцца разбіраць на студэнцкіх, прафсаюзных і камсамольскіх бюро. Дрэнна паводзяць сябе ў інтэрнаце камсамольцы А. Уткін, Б. Іваноў, М. Комлік, Б. Лачаў, Н. Лаппо. Я лічу, што студэнцкі савет правільна зрабіў, прыняўшы рашэнне аб высяленні іх з інтэрната. Такія меры дапамогуць узмацніць дысцыпліну, зрабіць інтэрнат месцам добрага і культурнага адпачынку.**

**В. НЯСЦЮК,**
**старшыня студсавета інтэрната № 5.**

# СУСТРЭЧА З ВАЕННЫМІ ЖУРНАЛІСТАМІ



Нядаўна студэнты і выкладчыкі факультэта журналістыкі сабраліся ў кабінеце друку разам з ваеннымі журналістамі, каб абмеркаваць другую кнігу «У рэдакцыю не вярнуўся». Апрача ваенных журналістаў у абмеркаванні кнігі прыняў удзел рэдактар «Настаўніцкай газеты» М. Е. Дастанка. Ён падзяліўся журналісцкім вопытам, падрабязна расказаў, як прыйшлося яму ў цяжкіх умовах Вялікай Айчыннай вайны выпускаць на Случчыне падпольную газету «Народны мсцівец».

Спадабаліся будучым журналістам выступленні нашых гасцей, супрацоўнікаў газеты БВА «Во славу Родины». Анатолю Белашэеву яшчэ ў памяці журналісцкія сцежкі, па якіх ён хадзіў у час вайны. Асабліва запамяталіся яркія эпізоды баёў на Курскай дузе, дзе ён са сваімі таварышамі выпускаў ваенную газету.

Аляксандр Абрамавіч Дракахруст больш гаварыў аб падзеях, якія адбываюцца ў цяперашні час. Цікавай была размова аб паездцы на Далёкі Ўсход, адкуль трэба было прывезці тэрміновы матэрыял пра Петрапаўлаўскую крэпасць.

З вялікай цікавасцю прысутныя слухалі расказ Дзмітрыя Дзмітрыевіча Калбасава пра спецыфіку работы ваенных журналістаў.

На здымку: супрацоўнік газеты «Во славу Родины» А. І. Белашэеў дзеліцца ўспамінамі пра журналісцкую дзейнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Фота і тэкст **І. АСКІРКІ.**

Музеі, якія створаны ў нашым універсітэце, карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Іх часта наведваюць не толькі студэнты і выкладчыкі вну, але і школьнікі горада Мінска.



На здымку: вучні 4 «А» класа санаторнаґлясной школы № 2 разглядаюць экспанаты ў заалагічным музеі.

Фота *І. Аскіркі.*

# У КНІЖНЫМ СТРАІ

Думка аб стварэнні свайго выдавецтва, відаць, пастаянна прысутнічала ў сценах універсітэта. Яе насычалі неабходнасць публікацый навуковых прац выкладчыцкага і студэнцкага калектываў, востры дэфіцыт шэрагу вучэбных матэрыялаў, неабходнасць хутчэй зрабіць ужыткам многіх каштоўны вопыт, які народжан у буднях лабараторый і кафедр.

І вось гэтая думка набыла рэальныя рысы. У канцы мінулага года Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову «Аб арганізацыі выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта».

Цяпер ужо амаль закончыўся арганізацыйны перыяд. Падабраны кадры, распрацаван тэматычны план на 1968 год, адпаведна яму прадукцыя універсітэцкага выдавецтва складзе 700 друкаваных лістоў. Будуць выпушчаны кнігі, брашуры, вучэбна-метадычныя распрацоўкі 75 назваў.

У гэтым годзе ўбачаць свет некалькі кніг, прысвечаных 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Рыхтуюцца да выдання зборнік «Некаторыя пытанні развіцця эканомікі Беларусі», другі выпуск «Нарысаў па гісторыі дзяржавы і права БССР», шматгадовая праца прафесара Л. С. Абэцэдарскага «Беларусь і Расія у XVII веку», зборнік «Пытанні беларускай публіцыстыкі», «Нарыс на экране» Е. Л. Бондаравай і Л. Ф. Шылавай і шэраг іншых.

Цяпер у працэсе падрыхтоўкі да выпуску знаходзяцца лекцыі па гісторыі КПСС (1937-1967 г. г.), работа кандыдата юрыдычных навук А. А. Галаўко «Дзейнасць Саветаў Беларусі па здзяйсненню эканамічнай палітыкі ў вёсцы ў 1927—1936 гг.», брашура кандыдата гістарычных навук Р. А. Нікольскай «Паходжанне рэлігіі і яе першабытныя формы». Рэдагуецца вялікае даследаванне доктара фалалагічных навук М. А. Жыдовіч «Назоўнік у беларускай мове». Рыхтуецца да друку хрэстаматыя па літаратуразнаўству (аўтары У. С. Карабан і Л. Л. Кароткая).

Пётр Сідаравіч пералічвае яшчэ цэлы шэраг назваў, а пасля робіць папрок аўтарам, якія ахвотна уключалі ў тэматычны план свае працы, а рукапісы ў тэрмін не прадстаўляюць. Асабліва затрымліваюцца многія зборнікі па грамадска-палітычных пытаннях.

Мы гутарым аб першых кроках новага выдавецтва у цесным пакоі друкарні. І, натуральна, напрошваецца пытанне: «А як з памяшканнем?» І тут твар дырэктара хмурнее. Спробы адваяваць для выдавецтва «жыццёвы прастор» пакуль закончыліся беспаспяхова. Цяперашняе становішча кватарантаў на мізэрнай плошчы друкарні адмоўна уплывае на працу ўсяго калектыва.

Дырэктар друкарні П. П. Журкевіч, які прысутнічаў на нашай гутарцы, выказаў і свае патрэбы. Памяшканням друкарні патрэбен рамонт, узнікае неабходнасць у аднаўленні абсталявання, цесна ў пераплётным цаху. З-за недахопаў памяшканняў вялікія цяжкасці выклікае падрыхтоўка паперы, захаванне гатовай прадукцыі.

Матэрыяльная база нашага новага, доўгачаканага выдавецтва выклікае сур'ёзную трывогу. Яго прадукцыі чакае шырокае кола чытачоў, таму трэба як мага хутчэй дамагчыся гэтага наваселля, паклапаціцца аб задавальненні патрэб друкарні. Тады мы з задавальненнем убачым у кніжным страі працы нашых аўтараў.

**А. НІКОЛЕНКА.**

# МАГІСТР АДПУСКАЕ ГРАХІ

На высокі бетонны падмурак узняўся «магістр» у сярэдневяковым адзенні. Да яго набліжаюцца «грэшнікі» з факеламі ў руках. «Магістр» урачыста падпальвае іх. ...Так пачаўся традыцыйны аб'яднаны медыум двух факультэтаў: філфака і журфака.

Студэнты ў гумарыстычнай форме каяліся ва ўчыненых «грахах», а «магістр» вялікадушна «адпускаў» іх.

Вялікі інтарэс і агульны смех прысутных выклікала чытанне «грахоў» студэнтаў-журналістаў, якія падлічылі, што за час навучання ва універсітэце яны спісалі столькі паперы, што яе, магчыма, хапіла б на некалькі тыражоў «Комсомольской правды». Але і гэты «грэх» быў адпушчаны.

З прывітальным словам ад выкладчыкаў выступіла сакратар партбюро філфака Вера Анісімаўна Захарава.

Спадабаліся ўсім і вершы аб жыцці студэнтаў, прачытаныя Алай Панкратавай, студэнткай другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

Выдатна справіўся са сваёй роляй «магістра» студэнт чацвёртага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Валерый Аносаў.

**Адк. рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

АТ 02104 Зак. № 414. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**